Весці БДПУ. Серыя 2. 2020. № 2. С. 99–102

УДК 329.272(438)(091)«1919/1921»+94(476) «1919/1921»

# БЕЛАРУСКІЯ ЗЕМЛІ Ў ПЛАНАХ ПАЛІТЫЧНЫХ КАНЦЭПЦЫЙ Ю. ПІЛСУДСКАГА І Р. ДМОЎСКАГА ПАДЧАС ПОЛЬСКА-САВЕЦКАЙ ВАЙНЫ (1919–1921 гг.)

**С. А. Ісакаў,**
*аспірант аддзела ваеннай гісторыі Беларусі Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі*

UDC 329.272(438)(091)«1919/1921»+94(476) «1919/1921»

# BELARUSIAN LANDS IN THE PLANS OF POLITICAL CONCEPTS OF YU. PILSUDSKI AND R. DMOUSKI DURING POLISH-SOVIET WAR (1919–1921)

**S. Isakau,**
*Postgraduate Student of the Department of Military History, Institute of History, National Academy of Sciences of Belarus*

Паступіў у рэдакцыю 13.04.20

Received on 13.04.20

У артыкуле змяшчаюцца асноўныя погляды польскіх палітыкаў адносна беларускіх зямель. У перыяд польска-савецкай вайны адлюстравана сутнасць палітыкі Польскай партыі сацыялістаў і Нацыянальна-дэмакратычнай партыі Польшчы ў адносінах да Беларусі. Вылучаюцца характэрныя асаблівасці правядзення канцэпцыі федэралізму і інкарпарацыі на практыцы. Значная ўвага надаецца ідэолагам канцэпцый Р. Дмоўскаму і Ю. Пілсудскаму.

*Ключавыя словы:* федэралізм, інкарпарацыя, польска-савецкая вайна, Р. Дмоўскі, Ю. Пілсудскі, эндэцыя, беларускія землі, паланізацыя, канцэпцыя.

The article contains the main views of Polish politicians on Belarusian lands. In the period of Polish-Soviet war the essence of the policy of the Polish socialist party and National-democratic party of Poland towards Belarus is reflected. The characteristic features of conducting the concept of federalism and incorporation in practice are defined. Significant attention is given to the ideologists of the concept R. Dmouski and Yu. Pilsudski.

*Keywords:* federalism, incorporation, Polish-Soviet war, R. Dmouski, Yu. Pilsudski, endecja, Belarusian lands, polonization, concept.

*Уводзіны.* У першай чвэрці XX ст. пры аднаўленні польскай дзяржаўнасці польская эліта была адзіная ў вызначэнні неабходнасці адбудовы Польскай дзяржавы. Аднак паўстала пытанне: якую палітыку праводзіць у адносінах да суседзяў, калі заставалася невызначаная мяжа Рэчы Паспалітай Польскай? Шляхі вырашэння гэтага пытання ў польскай грамадска-палітычнай думкі разышліся. На першы план выйшлі 2 палітычныя лагеры: федэралістаў і прадстаўнікоў інкарпарацыі.

У беларускай гістарыяграфіі пытанне федэрацыі і інкарпарацыі разглядаецца павярхоўна, у выніку чаго палітыка Ю. Пілсудскага і Р. Дмоўскага аналізуецца ў адным рэчышчы, без падрабязнага разбору іх адрозненняў. На сённяшні дзень абагульняючага навуковага даследавання, у якім супрацьпастаўляліся ідэі федэрацыі і інкарпарацыі ў 1919–1921 гг. не напісана. Беларускія навукоўцы ў асноўным звяртаюць увагу на аналіз палітыкі федэралізму, аднак абыходзяць сваёй увагай палітыку інкарпарацыі, якая фактычна і ажыццяўлялася на акупаванай тэрыторыі Беларусі. Асобныя пазіцыі адносна федэралізму былі прадстаўлены ў працах: У. Ладысева і П. Брыгадзіна [1], У. Круталевіча [2], Р. Лазько [3], М. Мязгі [4], В. Бароўскай [5], А. Трубчык [6] і інш.

Польская гістарыяграфія падрабязна разглядае федэратыўную і інкарпарацыйную канцэпцыю. Федэратыўную канцэпцыю даследавалі: А. Дзяруга [7], Я. Левандоўскі [8], А. Гарліцкі [9], У. Сулея [10], М. Галезоўскі, К. Гамулка [12], А. Новак [13], Г. Лукомскі [14] і інш. Канцэпцыю інкарпарацыі: Р. Вапінскі [15], К. Кавалец [16] і інш.

*Асноўная частка.* Узаемаадносіны беларусаў і палякаў маюць шматвяковую гісторыю. Фарміраванне адносін пачалося пры Вялікім Княстве Літоўскім, якое мела палітычныя сувязі з Каралеўствам Польскім. Не заўсёды гэтыя адносіны насілі пазітыўны характар. Палякі лічылі, што з моманту падпісання Крэўскай уніі ў 1385 г. Вялікае Княства Літоўскае будзе падпарадкоўвацца польскаму каралю і з'яўляцца яго васалам. Спробы канчатковай інкарпарацыі працягнуліся ў 1401 г., 1413 г., 1432 г., 1447–1448 гг., 1499 г., 1563 г. і дасягнулі свайго піку з моманту падпісання Люблінскай уніі [17, s. 3–19]. У 1569–1775 гг. адбывалася паланізацыя беларускай шляхты і магнатэрыі, якая сама цягнулася да польскіх залатых вольнасцей. Пасля падзелаў Рэчы Паспалітай палякі стараліся аднавіць сваю дзяржаўнасць на працягу 123 гадоў.

З пачаткам Першай сусветнай вайны асабліва востра ў польскім грамадстве паўстала пытанне аб шляхах аднаўлення польскай дзяржавы. У выніку заканчэння Першай сусветнай вайны і падпісання Кампʼенскага перамірʼя 11 лістапада 1918 г. Польшча атрымала незалежнасць і прыступіла да фарміравання сваіх межаў.

Згодна з канцэпцыяй федэралізму, ідэолагам якой з'яўляўся Ю. Пілсудскі. Польшча павінна адрадзіцца ў межах Рэчы Паспалітай 1772 г. Для гэтага патрэбна было стварыць федэралістычны саюз, у які б уваходзілі беларускія, літоўскія і ўкраінскія землі на чале з Польшчай [18, s. 66]. Ідэя зыходзіла з таго, што галоўным ворагам Польшчы, на думку Ю. Пілсудскага, з'яўлялася Расія, якой можна было супрацьстаяць толькі ў саюзе з суседнімі дзяржавамі. Тым самым прадугледжвалася вяртанне зямель Рэчы Паспалітай у межах 1772 г. і стварэнне «ўсходняй імперыі» на гістарычным падмурку ВКЛ [19, s. 186]. Гэта значыць экспансія палякаў павінна адбывацца на ўсходзе. Прыхільнікамі ідэі федэралізму з'яўляліся ў асноўным выхадцы з шля-

хецкіх сем'яў Літвы, Беларусі і Украіны. У аснове поглядаў прыхільнікаў Пілсудскага стаў лозунг *gente Lituanius, natione polonus.* (Па паходжанні – ліцвін, па нацыянальнасці – паляк).

Другая плынь паўстала і групавалася вакол нацыянальна-дэмакратычнай партыі, якая паўстала з «Нацыянальнай лігі» [20, s. 22], – першай палітычнай арганізацыі, якая аб'яднала польскіх нацыяналістаў, якія паходзілі родам з Кароны Польскай у апошняй чвэрці XIX ст. Яе ідэолагамі з'яўляліся Ян Паплаўскі, Жыгімонт Баліцкі і Раман Дмоўскі. Свае ідэі Я. Паплаўскі фармуляваў на старонках варшаўскага часопіса *Głos* [21]. Далейшае развіццё ідэі працягнулася на старонках газеты *Przegląd Wszechpolski* у 1895–1897 г. У канцы XIX – пачатку XX ст. у часопісе *Przegląd Wszechpolski* (які выходзіў у г. Львове) пад рэдакцыяй Р. Дмоўскага быў уведзены новы тэрмін – «Усходнія крэсы». У 1897 г. на тэрыторыі Польшчы паўстае Нацыянальна-дэмакратычная арганізацыя. Галоўная дактрына арганізацыі – заняццё вядучай ролі ў палітычным жыцці Польшчы. Галоўная мэта – пабудова моцнай Польскай дзяржавы. Для гэтага быў патрэбен моцны нацыянальны падмурак – большасць насельніцтва ў дзяржаве павінны былі складаць палякі. Да нацыянальных меншасцей планавалася прымяніць палітыку асіміляцыі, асадніцтва і актывізацыі мясцовых палякаў ва ўсіх сферах грамадска-палітычнага жыцця. Праграмма-мінімум, якая была распрацавана Я. Паплаўскім, вызначала тэрыторыю Польшчы ў межах: Вялікапольшчы, Памор'я, Усходняй Прусіі, Горнага Шлёнска і Галіцыі. Гэтыя землі фактычна адпавядалі межам Каралеўства Польскага з перавагай польскага насельніцтва. Галоўным ворагам Польшчы, на думку Р. Дмоўскага, з'яўляліся немцы, бо лічылася, што яны стаялі на больш высокім узроўні цывілізацыйнага развіцця. Сілезія, Усходняя Прусія называліся «Заходнімі Крэсамі», і ў першую чаргу трэба было далучыць гэтыя землі, а не землі былога ВКЛ, якія ў эканамічным развіцці адставалі ад Захаду. Праграмма-максімум прадугледжвала ўключэнне ў склад Рэчы Паспалітай: Ковенскай, Віленскай і Гродзенскай губерняў, большай часткі Мінскай губерні і Валыні, а таксама Пласкіраўскага і Каменецкага паветаў Падолля [19, s. 225]. Гэтыя акрэсленыя тэрыторыі адпавядалі другому падзелу Рэчы Паспалітай. У адрозненне ад дзейнасці на «Заходніх Крэсах», якія былі больш цывілізацыйна развіты, на думку Р. Дмоўскага, на ўсходніх землях павінна праводзіцца палітыка каланізацыі беларускага і ўкраінскага насельніцтва. Чаму эндэкі вырашылі ісці па праграме-максімум? Р. Дмоўскі лічыў, што не важна, хто пражывае на дадзенай тэрыторыі, важна тое, што Польшча павінна быць па тэрыторыі вялікай, бо яна знаходзіцца паміж Германіяй і Расіяй. Аднак пры гэтым дадзеная тэрыторыя павінна быць заселена пераважна палякамі. Праграмма дзейнасці мінімум і максімум Р. Дмоўскага фактычна не змянілася з канца XIX ст. Гэта пацвярджае і польскі даследчык К. Кавалец, які пісаў пра Дмоўскага, «што ён заявіў сябе як чалавек з поглядамі сфарміраванымі і захаванымі да канца жыцця без вялікіх змен [16, s. 12].

Беларускае пытанне ў рэчышчы дзвюх гэтых канцэпцый разглядалася быццам бы па-рознаму, аднак сутнасць была аднолькавая. Адносіны да беларускіх зямель грунтаваліся на польскіх гістарычных і палітычных ведах, якія нівеліравалі (згладжвалі) беларускую праблематыку. Польскія гісторыкі і палітыкі прытрымліваліся высноў, што ў той час беларусы былі не ў стане стварыць сваю дзяржаву.

Як ўжо адзначалася, ідэя федэралізму была арыентавана на літоўскія, беларускія і ўкраінскія землі. Аднак эліты ўсходніх суседзяў разумелі па-свойму палітыку федэралізму. Літоўскія палітыкі мелі сваё бачанне на дадзеную праблему. Усё зыходзіла з таго, што калі б была створана федэрацыя на чале з Польшчай, то, па ўсёй бачнасці, літоўцы былі б асіміляваны. Літоўскае кіраўніцтва вырашыла ісці па шляху стварэння незалежнай дзяржавы са сталіцай у Вільні. Ю. Пілсудскі не мог з гэтым пагадзіцца, бо лічыў горад цэнтрам польскай культуры на землях былога ВКЛ. Іншым кампанентам Ю. Пілсудскі лічыў беларускія землі, і ў той жа час скептычна ставіўся да партнёрства з беларускім народам. Прыкладам можа служыць наведванне горада Мінска 19 верасня 1919 г. Ю. Пілсудскім і сказаныя ім словы: «Не падабаецца мне ваш Мінск .... шмат руска-жыдоўскім духам пахне, на вуліцы не чуваць іншага, як расійскай мовы» [22, s. 328]. Падчас аўдыенцыі 19 верасня 1919 г. для 44 дэлегацый на прамову старшыні Беларускага нацыянальнага камітэта Ю. Пілсудскі адказаў на беларускай мове. І пры гэтым узгадаў, што ён «сын той жа зямлі, што і вы, і таму лепш разумею і адчуваю ўсе беды і няшчасці, якія былі лёсам гэтай зямлі» [10, s. 200; 23, с. 45].

Іншая сітуацыя была з тэрыторыяй Украіны. 23 мая 1919 г. Польскі Сейм прыняў пастанову аб прызнанні права ўкраінцаў на ўласную дзяржаўнасць «на тэрыторыі былой Расійскай Імперыі» з акалічнасцю адыходу Усходняй Галіцыі ў склад польскай дзяржавы [24, s. 181]. У планах федэралістаў і прадстаўнікоў інкарпарацыі тэрыторыя Усходняй Галіцыі павінна быць далучана да Польшчы. На тэрыторыі часткова правабярэжнай і левабярэжнай Украіны ўтварэнне дзяржавы пад кантролем Польшчы. Вясной Ю. Пілсудскі пачаў паход на Украіну. 7 мая 1920 г. быў заняты г. Кіеў, дзе адбыўся сумесны парад войск УНР і Польскай рэспублікі. 14 мая 1920 г. пачалося наступленне Чырвонай Арміі, якое прывяло да адступлення польскіх войскаў да Варшавы. У выніку гэтых падзей, канчаткова быў засведчаны крах ідэі федэралізму.

Для рэалізацыі ідэі федэралізму ў жыццё была створана ў маі 1919 г. адміністрацыйна-тэрытарыяльная сістэма польскага кіравання – Грамадзянскае ўпраўленне ўсходніх зямель (ГУУЗ) на чале з мясцовым землеўласнікам і прадстаўніком федэрацыйнага лагера Е. Асмалоўскім. Усе значныя пасады ва ўпраўленні былі аддадзены мясцовым чыноўнікам. Беларускія землі ўвайшлі ў склад: Віленскай, Брэсцкай і Мінскай акруг. Аднак палітыка, якую на месцах ажыццяўлялі польскія ўрадоўцы, адрознілася. На тэрыторыі Брэсцкай і Віленскіх акруг праводзіліся мерапрыемствы па далучэнні гэтых зямель у склад Польшчы. У выніку чаго больш моцныя польскія арганізацыі рабілі агітацыю і збор подпісаў сялян за далучэнне да Польшчы. Жорстка дзейнічала польская жандармерыя, якая затрымлівала дзеячоў беларускага нацыянальнага руху. Рабіліся перашкоды з боку польскіх школьных інспектараў у адкрыцці беларускіх школ.

1 лютага 1920 г. адбылася віленская нарада ГУУЗ, на якой абмяркоўвалася беларускае пытанне. Ю. Пілсудскі адзначыў: «Я выступаю за пэўныя знач-

ныя саступкі ў культурным плане для беларусаў, аднак палітычных саступак на карысць беларусаў не хачу» [25]. Гэтыя словы адпавядалі рэчаіснасці, бо палітыка ў Мінскай акрузе адпавядала пабудове «беларускага П'емонта».

З пачатку 1920 г. Пілсудскі пачаў змяняць свае погляды наконт будучай федэрацыі. У адозве 22 красавіка 1919 г. і прамове ў Мінску 19 верасня 1919 г. ён казаў аб тым, што насельніцтва гэтых абшараў павінна вырашаць свой лёс асабіста. Гэтыя словы былі падтрыманы палітычнымі лідарамі Антанты, супраць выступілі эндэкі на чале з Р. Дмоўскім. Ю. Пілсудскі ў адрозненне ад Р. Дмоўскага пабываў на тэрыторыі Беларусі неаднаразова. У 1919 г. Пілсудскі пабываў у Пінску, Паставах, Лідзе, Маладзечне, Бастунах, Гродне, Радашковічах, Смаргоні, Мінску і інш. У 1920 г. наведаў Баранавічы, Маладзечна, Крывічы, Ліпшчаны, Ліду, Скідзель, Слонім, Ваўкавыск, Зэльву і інш., у 1921 г. – Вілейку, Ліду і інш. [26, с. 181–186]. Калі начальнік Польскай дзяржавы бываў на тэрыторыі Беларусі, то ён у асноўным сустракаўся: з войскам, мясцовай грамадскасцю, арганізацыямі і асобнымі палітыкамі.

9 верасня 1920 г. пасля польскага наступлення канца лета – восені 1920 г. было створана «Упраўленне прыфрантавых і этапных тэрыторый» (УПіЭТ). Улада на захопленай тэрыторыі Беларусі аказалася ў руках ваеннай адміністрацыі, якая фактычна праводзіла палітыку інкарпарацыі. Спроба аб'яднання Літвы, Беларусі і Украіны пад кіраўніцтвам Польшчы правалілася.

*Заключэнне.* Канцэпцыі інкарпарацыі і федэралізму ўзніклі ў канцы XIX ст. Абодва праекты ствараліся для аднаўлення будучай Польшчы. Пілсудскі быў таленавітым палітыкам, які змог зарыентавацца ў любых абставінах. Аднак планы польскага кіраўніка засталіся не рэлізаваны, спачатку было падпісана прэмінарнае перамір'е 12 кастрычніка 1920 г., а 18 сакавіка 1921 г. Рыжская мірная дамова, якая паставіла крыж на канцэпцыі федэралізму і асабіста Ю. Пілсудскага. Перамогу атрымала канцэпцыя інкарпарацыі Р. Дмоўскага, якая была больш прывабная да простых палякаў. Заўсёды заставаўся на сваіх пазіцыях пры міжнародных перамовах, як гэта было на Парыжскай мірнай канферэнцыі, пры падпісанні Версальскага мірнага дагавору і Рыжскага міру. Усе міжнародныя перамовы і мірныя дагаворы ад Польшчы вялі нацыянал-дэмакраты, якія адстойвалі свае інтарэсы. З іншага боку, кіраўнік польскай дзяржавы спрабаваў стварыць федэрацыю Польшчы, Літвы, Беларусі і Украіны. Для гэтага было створана ГУУЗ, якое дзейнічала на гэтых абшарах. Адозвы і выступленні Пілсудскага да жыхароў былога ВКЛ і Украіны былі падобныя. З гэтага вынікала, што польскі кіраўнік паводзіў сябе: «з беларусамі, як беларус», і «з украінцамі, як украінец», які хацеў дапамагчы ў стварэнні дзяржаў, якія будуць у саюзе, падначаленым Польшчы. Адна з адрозненных асаблівасцей палітыкі федэралізму было тое, што ўсе дзеячы паходзілі з былых тэрыторый ВКЛ, а палітыкі, якія прытрымліваліся канцэпцыі інкарпарацыі, з Кароны Польскай.

*Літаратура*


1. *Ладысеў, У. Ф.* Паміж Усходам і Захадам: станаўленне дзяржаўнасці і тэрытарыяльнай цэласнасці Беларусі (1917–1939 гг.) / У. Ф. Ладысеў. П. І. Брыгадзін. – Мінск : БДУ, 2003. – 307 с.
2. *Круталевич, В.* История Беларуси. Становление национальной державности / В. Круталевич. – 2-е изд., доп. – Минск : Право и экономика, 2003. – 232 с.
3. *Лазько, Р.* Перад патопам. Еўрапейская палітыка Польшчы (1932–1939 гг.) / Р. Лазько. – Мінск : БДУ, 2000. – 354 с.
4. *Мязга, М.* Канцэпцыя Федэрацыі і перспектывы Беларускай дзяржаўнасці / М. Мязга // Дзяржаўнасць Беларусі ў ХХ стагоддзі: 100-годдзя абвяшчэння Беларускай Народнай Рэспублікі і Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі : зб. навук. арт. / рэдкал.: В. А. Міхедзька (гал. рэд.) [і інш.]; Гомельскі дзярж. ун-т імя Ф. Скарыны. – Гомель : ГДУ імя Ф. Скарыны, 2019. – С. 3–9.
5. *Бароўская, В.* Беларускае пытанне на савецка-польскіх перагаворах 1918–1921 гг. / В. Бароўская. – Мінск : Беларус. навука, 2017. – 269 с.
6. *Трубчык, А.* Адукацыйная палітыка польскіх улад на беларускай тэрыторыі Грамадзянскага Упраўлення Усходніх Зямель (люты 1919 – верасень 1920 г.) / А. Трубчык // Вестник Полоцкого государственного университета. Серия А. Гуманитарные науки, 2016. – № 1. – С. 123–129.
7. *Deruga, A.* Polityka wschodnia Polski wobec ziem Litwy, Białorusi i Ukrainy (1917–1919) / A. Deruga. – Warszawa : Książka i Wiedza, 1969. – 317 s.
8. *Lewandowski, J.* Federalizm. Litwa I Białoruś w polityce obozu belwederskiego (XI. 1918 – VI. 1920). / J. Lewandowski. – Warszawa : PWN, 1962. – 271 s.
9. *Гарліцкі, А.* Юзаф Пілсудскі 1867–1935 / А. Гарліцкі ; пер. з пол. Я. Салейчука. – Мінск : А. М. Янушкевіч, 2019. – 760 с.
10. *Сулея, У.* Юзаф Пілсудскі / У. Сулея ; пер. з. пол. Я. Салейчук. – Мінск : А. М. Янушкевіч, 2018. – 354 с.


*References*


1. *Ladyseŭ, U. F.* Pamizh Uskhodam i Zahadam: stanaŭlenne dzyarzhaŭnasci i terytaryyal'naj celasnasci Belarusi (1917–1939 gg.) / U. F. Ladyseŭ. P. I. Brygadzin. – Minsk : BDU, 2003. – 307 s.
2. *Krutalevich, V.* Istoriya Belarusi. Stanovlenie nacional'noj derzhavnosti / V. Krutalevich. – 2-e izd., dop. – Minsk : Pravo i ekonomika, 2003. – 232 s.
3. *Laz'ko, R.* Perad patopam. Eŭrapejskaya palityka Pol'shchy (1932–1939 gg.) / R. Laz'ko. – Minsk : BDU, 2000. – 354 s.
4. *Myazga, M.* Kancepcyya Federacyi i perspektyvy Belaruskaj dzyarzhaŭnasci / M. Myazga // Dzyarzhaŭnasc' Belarusi ŭ HH stagoddzi: 100-goddzya abvyashchennya Belaruskaj Narodnaj Respubliki i Belaruskaj Saveckaj Sacyyalistychnaj Respubliki : zb. navuk. art. / redkal.: V. A. Mihedz'ka (gal. red.) [i insh.]; Gomel'ski dzyarzh. un-t imya F. Skaryny. – Gomel' : GDU imya F. Skaryny, 2019. – S. 3–9.
5. *Baroŭskaya, V.* Belaruskae pytanne na savecka-pol'skih peragavorah 1918–1921 gg. / V. Baroŭskaya. – Minsk : Belarus. navuka, 2017. – 269 s.
6. *Trubchyk, A.* Adukacyjnaya palityka pol'skih ulad na belaruskaj terytoryi Gramadzyanskaga Upraŭlennya Uskhodnih Zyamel' (lyuty 1919 – verasen' 1920 g.) / A. Trubchyk // Vestnik Polockogo gosudarstvennogo universiteta. Seriya A. Gumanitarnye nauki, 2016. – № 1. – S. 123–129.
7. *Deruga, A.* Polityka wschodnia Polski wobec ziem Litwy, Białorusi i Ukrainy (1917–1919) / A. Deruga. – Warszawa : Książka i Wiedza, 1969. – 317 s.
8. *Lewandowski, J.* Federalizm. Litwa I Białoruś w polityce obozu belwederskiego (XI. 1918 – VI. 1920). / J. Lewandowski. – Warszawa : PWN, 1962. – 271 s
9. *Garlicki, A.* Yuzaf Pilsudski 1867–1935 / A. Garlicki ; per. z pol. Ya. Salejchuka. – Minsk : A. M. Yanushkevich, 2019. – 760 s.
10. *Suleya, U.* Yuzaf Pilsudski / U. Suleya ; per. z. pol. Ya. Salejchuk. – Minsk : A. M. Yanushkevich, 2018. – 354 s.

11. *Gałęzowski, M.* Federacja czy inkorporacja? / M. Gałęzowski // Od Niepodległości do Niepodległości. Historia Polski 1918–1989. Instytut Pamięci Narodowej. – Warszawa : ALNUS, 2014. – C. 32–34.
12. *Гамулка, К.* Паміж Польшчай і Расіяй. Беларусь у канцэпцыях польскіх палітычных фарміраванняў 1918–1922 / К. Гамулка ; пер. з польскай мовы. – Вільня, 2008. – 256 с.
13. *Nowak, A.* Wizja polityczna Józefa Piłsudskiego. / A. Nowak // Józef Piłsudski wyobrażnia i dzieło polityczne : pod redakcją J. Machnika i A. Nowaka; Polska akademia umiejętności. Komisja środkowoeuropejska. – Kraków : Secesja, 2006. – S. 11–24.
14. *Łukomski, G.* W obronie Wilna, Grodna i Mińska. Front Litewsko–Białoruski wojny polsko–bolszewickiej 1918–1920 / G. Łukomski, B. Polak. – Koszalin–Warszawa : Wyźsza Szkoła Inżynierska w Koszalinie, 1994. – 358 s.
15. *Wapiński, R.* Endecka koncepcja polityki wschodniej w latach 1917–1921. – Gdańsk, 1967. – 50 s.
16. *Kawalec, K.* Roman Dmowski. Ossolineum. / K. Kawalec. – Wroclaw : Zaklad Narodowy im. Ossolińskich, 2002. – 331 s.
17. *Mościcki, H.* Unia Litwy z Polską / H. Mościcki. – Warszawa: Nakład Gebethnera i Wolfa, 1919. – 105 s.
18. *Rozwadowski, P.* Niepodległość i granice Polski / P. Rozwadowski. – Warszawa : Bellona, 2015. – 104 s.
19. *Nowak, A.* Historie politycznych tradycji / A. Nowak. – Kraków : Arcana, 2012. – 399 s.
20. *Madras, T.* Między Odrą a Dnieprem. Myśl geopolityczna narodowej demokracji do 1922 roku / T. Madras // Zeszyty Naukowe Politechniki Białostockiej. Ekonomia i Zarządzanie, 2009. – № 1. – C. 20–36.
21. Głos [Электронны рэсурс]. Tygodnik Literacko-Społeczno–Polityczny. – Warszawa, 2012. – Рэжым доступу: https://pl.wikipedia.org/wiki/G%C5%82os_(pismo). – Дата доступу: 10.03.2020.
22. *Nowak, A.* Polska i trzy Rosje / A. Nowak. – Kraków : Arcana, 2015. – 624 s.
23. *Астрога, В.* Пілсудскі ў Менску. Хроніка аднаго візіту / В. Астрога, В. Скалабан // Спадчына. – 1998. – № 4. – С. 32–53.
24. *Kisielewski, T.* Piłsudski, Dmowski i Niepodległość / T. Kisielewski. – Poznań : REBIS, 2018. – 302 s.
25. Denis Krawczenko [Электронны рэсурс] // Wypowiedź Józefa Piłsudskiego z 1 lutego 1920 roku. – 1920. – 1 lutego. – Рэжым доступу: https://www.facebook.com/groups/polacynakresach/permalink/2523155751254344/. – Дата доступу: 22.11.2019.
26. *Інеўска, Э.* Юзаф Пілсудскі. Крэсавыя аповеды / Э. Інэўска. – Мінск : Галіяфы, 2018. – 187 с.

11. *Gałęzowski, M.* Federacja czy inkorporacja? / M. Gałęzowski // Od Niepodległości do Niepodległości. Historia Polski 1918–1989. Instytut Pamięci Narodowej. – Warszawa : ALNUS, 2014. – C. 32–34.
12. *Гамулка, К.* Паміж Польшчай і Расіяй. Беларусь у канцэпцыях польскіх палітычных фарміраванняў 1918–1922 / К. Гамулка ; пер. з польскай мовы. – Вільня, 2008. – 256 с.
13. *Nowak, A.* Wizja polityczna Józefa Piłsudskiego. / A. Nowak // Józef Piłsudski wyobrażnia i dzieło polityczne : pod redakcją J. Machnika i A. Nowaka; Polska akademia umiejętności. Komisja środkowoeuropejska. – Kraków : Secesja, 2006. – S. 11–24.
14. *Łukomski, G.* W obronie Wilna, Grodna i Mińska. Front Litewsko–Białoruski wojny polsko–bolszewickiej 1918–1920 / G. Łukomski, B. Polak. – Koszalin–Warszawa : Wyźsza Szkoła Inżynierska w Koszalinie, 1994. – 358 s.
15. *Wapiński, R.* Endecka koncepcja polityki wschodniej w latach 1917–1921. – Gdańsk, 1967. – 50 s.
16. *Kawalec, K.* Roman Dmowski. Ossolineum. / K. Kawalec. – Wroclaw : Zaklad Narodowy im. Ossolińskich, 2002. – 331 s.
17. *Mościcki, H.* Unia Litwy z Polską / H. Mościcki. – Warszawa: Nakład Gebethnera i Wolfa, 1919. – 105 s.
18. *Rozwadowski, P.* Niepodległość i granice Polski / P. Rozwadowski. – Warszawa : Bellona, 2015. – 104 s.
19. *Nowak, A.* Historie politycznych tradycji / A. Nowak. – Kraków : Arcana, 2012. – 399 s.
20. *Madras, T.* Między Odrą a Dnieprem. Myśl geopolityczna narodowej demokracji do 1922 roku / T. Madras // Zeszyty Naukowe Politechniki Białostockiej. Ekonomia i Zarządzanie, 2009. – № 1. – C. 20–36.
21. Głos [Электронны рэсурс]. Tygodnik Literacko-Społeczno–Polityczny. – Warszawa, 2012. – Рэжым доступу: https://pl.wikipedia.org/wiki/G%C5%82os_(pismo). – Дата доступу: 10.03.2020.
22. *Nowak, A.* Polska i trzy Rosje / A. Nowak. – Kraków : Arcana, 2015. – 624 s.
23. *Astroga, V.* Pilsudski ў Mensku. Hronika adnago vizitu / V. Astroga, V. Skalaban // Spadchyna. – 1998. – № 4. – S. 32–53.
24. *Kisielewski, T.* Piłsudski, Dmowski i Niepodległość / T. Kisielewski. – Poznań : REBIS, 2018. – 302 s.
25. Denis Krawczenko [Электронны рэсурс] // Wypowiedź Józefa Piłsudskiego z 1 lutego 1920 roku. – 1920. – 1 lutego. – Рэжым доступу: https://www.facebook.com/groups/polacynakresach/permalink/2523155751254344/. – Дата доступу: 22.11.2019
26. Ineўska, E. Yuzaf Pilsudski. Kresavyya apovedy / E. Ineўska. – Minsk : Galiyafy, 2018. – 187 s.